**ЛАКО́ТКА** Аляксандр Іванавіч (н. 25.1.1955, в. Кузьмічы Дзятлаўска-



*А.І.Лакотка.*

га р-на), беларускі архітэктар, гісторык, мастацтвазнавец. Чл.-кар. НАН Беларусі (2004). Д-р гіст. навук (1993), д-р архітэктуры (2001), праф. (2003). Скончыў Бел. політэхн. ін-т (1977). З 1978 працаваў у Бел. дзярж.



БГПУ БИБЛИОТЕКА
ИНВ. № 1717448

музеі нар. архітэктуры і побыту (з 1982 заг. аддзела, у 1989—95 намеснік дырэктара). Адначасова з 1982 у Бел. рэстаўрацыйна-праектным ін-це, з 1995 у Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі (з 1997 намеснік дырэктара, з 2004 дырэктар). З 2012 дырэктар Цэнтра даследаванняў бел. культуры, мовы і л-ры НАН Беларусі. Аўтар праектаў генплана Бел. дзярж. музея нар. архітэктуры і побыту, помнікаў драўлянага культавага дойлідства Беларусі, ахоўных зон горадабуд. тэр. Мінска 1940—60-х гг., аднаўлення комплексу Мінскага замчышча, музея нар. архітэктуры ў культ.-турыстычным комплексе «Мой родны кут — Сабалі». Даследуе праблемы матэрыяльнай культуры Беларусі, гісторыі айчыннай і сусв. архітэктуры ў сацыякульт. кантэксце. Аўтар манаграфій «Нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры» (1999), «Драўлянае сакральна-манументальнае дойлідства Беларусі» (2003), «Гісторыка-культурныя ландшафты Беларусі» (2006), «Архітэктура: авангард, абсурд, фантастыка», «Архітэктура Беларусі ў еўрапейскім і сусветным кантэксце» (абедзве 2012). Навук. рэд. шматтомных выданняў «Архітэктура Беларусі: нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце» (2005—09), «Гарады і вёскі Беларусі» (з 2004), навук. зб. «Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі» (з 2006) і інш.

*Тв.*: Сілуэты старога Мінска: Нарысы драўлянай архітэктуры. Мінск, 1991; Бераг вандраванняў, ці Адкуль у Беларусі мячэці. Мінск, 1994; Пад стрэхамі прашчураў. Мінск, 1995.

*Літ.*: Пілipенка М.Ф. Аляксандр Іванавіч Лакотка // Весці НАН Беларусі. Серыя гуманітарных навук. 2005. № 1.

*Ю.Ю.Захарына.*

БГПУ БИБЛИОТЕКА
ИНВ №